На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

№ 57 (179)

Серада, 2 красавіка 1997 г.

Выдаецца
на беларускай і рускай мовах

Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	5.32	18.38
Магілёў	5.32	18.36
Гомель	5.31	18.31
Мінск	5.45	18.46
Гродна	6.00	18.59
Брэст	6.01	18.59

"Народная воля" – з вамі

Вось вам, Ніна Якаўлеўна, ваш тэлевізар

Колькі разоў мне шанцавала ў жыцці? Калі-небудзь кожны з нас задаваў сабе такое пытанне. Ніна Якаўлеўна Місюкевіч, пенсіянерка з невялічкага горада Клецка, упершыню паразважала аб падарунках лёсу, калі стала пераможцай розыгрышу латарэі, якую праводзіла "Народная воля" ў час падпісной кампаніі, і выйграла тэлевізар "Daewoo".

— Не магу сказаць, што мне ў жыцці не шанцавала. Было па-рознаму: шчасце, калі нарадзіла дзвюх дачок, гора, калі малодшая цяжка захварэла і стала інвалідам II групы.

Усё жыццё я працавала фармацэўтам, зарплата была маленькая, але жылі надзеяй на лепшае заўтра. Праўда, замест лепшага атрымалася тое, што адбываецца сёння ў рэспубліцы.

— Пенсіі хапае на жыццё?

— Жывём толькі за кошт таго, што маем невялікі зямельны надзел і хатнюю жывёлу. Нам, пенсіянерам з правінцыі, мне здаецца, крыху лягчэй, чым гараджанам. Клецк — маленькі гарадок, побач шмат вёсак, на рынак да нас сяляне вязуць малако, смятану, сыр, яйкі. Купляем у іх, а не ў магазіне: гэта не толькі смачней, але і танней.

— Чым жыве сёння правінцыя?

— Напэўна, як і ўся краіна, палітыкай. Сядзім ля тэлевізараў, чытаем газеты, сочым за падзеямі і ўсё чакаем, калі стане хоць трохі лягчэй жыць.

— Спадзеецеся на наш урад?

— Кожны вырашае сам, каму верыць, на каго ўскладаць свае надзеі. Некаторыя нашыя знаёмыя слепа вераць прэзідэнту, іншыя, наадварот, абвінавачваюць яго ў тым, што шмат абяцае і нічога не выконвае.

— Ніна Якаўлеўна, давайце пагаворым аб больш прыемным. Вы рады, што выйгралі тэлевізар?

— Безумоўна. Наш тэлевізар стары, чорна-белы. Новы мы б ніколі не купілі: хіба мы можам сабраць тыя мільёны, якія ён каштуе! Дзякуй "Народнай волі"!

— Ваша сям'я наш даўні чытач?

— Яшчэ мінулым летам нам даў пачытаць газету наш сусед, і мы яе адразу выпісалі. Потым разам з вамі перажылі блакаду, а цяпер зноў атрымліваем "Народную волю" па пошце. Вельмі любім чытаць яе. У газеце столькі цікавых артыкулаў і, галоўнае, праўдзівых!

— І традыцыйнае пытанне: што б вы пажадалі "Народнай волі"?

— Не мяняцца. А ўсім супрацоўнікам газеты жадаю здароўя, шчасця і спакою ў іх сем'ях.

Гутарыла Марыя НАРЭЙКА.

Дзе акадэмік Платонаў?

Гэта імя добра вядомае ў свеце. Акадэмік Платонаў — буйнейшы матэматык, адзначаны многімі высокімі міжнароднымі ўзнагародамі. Ён узначальваў інстытут матэматыкі Акадэміі навук, быў прэзідэнтам і самой акадэміі. Але некалькі гадоў таму выехаў за мяжу, працаваў у Германіі, Злучаных Штатах Амерыкі.

Не так даўно з'явілася інфармацыя аб тым, што вядомы навуковец спрабаваў зачапіцца ў Мінску, ды безвынікова. Ці праўда гэта? Я спрабаваў высветліць гэта. Але ўсё аказалася пакрыта нейкай незразумелай тайнай. У інстытуце матэматыкі ніхто "нічога не ведаў" аб лёсе буйнага вучонага і месцы яго знаходжання. У аддзеле кадраў Акадэміі навук адмовіліся нават паведаміць аб тым, працуе ці не акадэмік Платонаў у яе сістэме. Што за тайна?

Толькі ў ведамстве галоўнага вучонага сакратара Акадэміі навук удалося тое-сёе высветліць. Нам паведамілі, што сапраўды Платонаў выказваў жаданне "атрымаць лабараторыю" ў інстытуце матэматыкі. Але задаволіць яго просьбу аказалася праблематычным. Маўляў, нашкодзіў яго артыкул у друку, у якім былі дадзены нялепшыя характарыстыкі некаторым вучоным-матэматыкам. Яму прапаноўвалі варыянты ў другіх інстытутах фізіка-матэматычнага профілю. Але ўжо У.Платонаў не пагадзіўся.

Такім чынам, вядомы даследчык Платонаў працягвае працаваць за мяжой. У гэтыя дні — у Канадзе. Ці там больш уважліва ставяцца да буйных вучоных, ці, магчыма, сам акадэмік больш пакладзіста паводзіць сябе за мяжой?

Андрэй РУСАКОВІЧ.

Россиянам подставляют плечо американцы

На своей встрече в Хельсинки президенты Клинтон и Ельцин приняли совместное заявление, обрисовывающее новую инициативу по стимулированию инвестиций в экономику России и содействию вступлению России в международные экономические организации. Эта инициатива является развитием крепкого экономического партнерства, в рамках которого США оказали России поддержку на сумму 4,8 миллиарда долларов в форме торговли и инвестиций, 4,7 миллиарда долларов в форме технического содействия и гуманитарной помощи, 1,2 миллиарда долларов в форме сельскохозяйственных кредитов и более 26 миллиардов долларов в форме финансирования от МВФ и Всемирного банка. Президенты решили подкрепить исторический переход России к рыночной экономике, создавать новые возможности для торговли и инвестиций и стимулировать создание рабочих мест в обеих странах.

Экономическое сотрудничество России, США и международного сообщества внесло свой вклад в:

формирование частного сектора, который сегодня дает 70 процентов национального дохода России и обеспечивает занятость 55 процентов ее рабочей силы;

макроэкономическую стабилизацию, в том числе обеспечение стабильности рубля и резкое сокращение инфляции — со 131 процентов в 1995 году до 22 процентов в 1996 году;

рост российского рынка акций на 400 процентов за период с марта 1996 по март 1997 года и впервые появившуюся для русских и иностранцев возможность торговать российскими акциями и облигациями;

крупную приватизацию собственности (более 120000 предприятий) за беспрецедентно короткий исторический срок.

Президент Ельцин намерен осуществить смелую программу стимулирования инвестиций и перехода России к следующей фазе экономических реформ, в том числе:

комплексную налоговую реформу с целью упрощения и упорядочения налогов на доходы предприятий и частных лиц;

законы об укреплении соглашений в разделе продукции, необходимых для реализации инвестиций в энергетику в объеме 50—60 миллиардов долларов;

строгое законодательство о борьбе с преступностью, в том числе принятие уголовно-процессуального кодекса и законов против отмывания денег и организованной преступности;

ратификацию американо-российского Договора о двусторонних инвестициях.

Президент Клинтон стремится довести объем помощи России и ННГ со стороны США до 900 миллионов долларов в 1998 году, тогда как сейчас эта цифра составляет 625 миллионов. Будут использованы новые фонды для содействия торговле и инвестициям, для стимулирования роста в России и других ННГ.

Президенты предпримут все усилия для того, чтобы Россия вступила в 1997 году в Парижский клуб и в 1998 году во Всемирную торговую организацию.

ЮСИА.

СТАРЫЕ ПЕСНИ О ГЛАВНОМ

Спасибо властям, на прошлой неделе нам не пришлось долго ломать голову над тем, что же главное. Главное — война, которую власть наконец открыто объявила народу. Людей десятками хватали и таскали в суды, штрафовали. Сдуру выслали американского дипломата, да так, что собственный посол не сумел добраться до пункта назначения. А чтобы мир не узнал о происходящем в стране, попытались заткнуть рот российским телеканалам. Мало того, что российское общественное мнение вынудило даже сверхдипломатичнейшего г-на Ястржембского на второй день после объявления всего этого кошмара нашим "внутренним делом" изменить свое мнение и пусть сдержанно, но осудить происходящее в Беларуси. В довершение всего мы заработали — вроде, четвертую? — ноту Госдепартамента США и окончательное установление "железного занавеса". А закончилось все высылкой одного из самых мужественных и честных журналистов — руководителя корреспондентского пункта НТВ в Польше и Беларуси Александра Ступникова. Мол, он и его правдивые репортажи дестабилизируют обстановку! Как это — "дестабилизируют"? Мешают сельскохозяйственной страде, что ли? Это, так сказать, излюбленная песня белорусского государства: кругом враги!

Интересно, эта тема хоть как-то ложится на музыку? Если "да", то пусть простит нас читатель: мы посвящаем эту песню нашему коллеге Александру Ступникову. Мы с тобой, Саша!

ВАРШАВЯНКА

Стихи Г.Кржижановского
Аранжировка А.Лукавого

Вихри враждебные веют над Минском,
Бьют нас дубинки, и судят суды.
Власть поступает с народом по-свински,
Чтоб избежать неизбежной беды.

ПРИПЕВ:
Но в Беларуси люди не струсят:
Будет свободной страна белорусов!
Будет "Пагоня", как прошлого память!
Будет парить красно-белое знамя!

Рты затыкают и прочь высылают,
Чтобы о правде народ не узнал.
С телеэкрана собаками лают
Те, кто на почести совесть сменял.

ПРИПЕВ:
Но в Беларуси люди не струсят:
Будет свободной страна белорусов!
Будет "Пагоня", как прошлого память!
Будет парить красно-белое знамя!

Честное слово мешает обману,
Правда опасней, чем бомба и нож.
Можно объехать различные страны:
Мало таких, где господствует ложь.

ПРИПЕВ:
Но в Беларуси люди не струсят:
Будет свободной страна белорусов!
Будет "Пагоня", как прошлого память!
Будет парить красно-белое знамя!

Дыпламатычны кур'ер

Беларусь зацікаўлена ў развіцці ўзаемавыгадных адносін з ЗША на раўнапраўных умовах

Як паведамляла ўжо БелТА, назначаны нядаўна Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Злучаных Штатах Амерыкі Валерый Цапкала быў выкліканы Міністэрствам замежных спраў нашай рэспублікі для кансультацый у Мінск. Згодна з распаўсюджанай знешнепалітычным ведамствам нашай рэспублікі заявай адносна становішча, якое склалася ў двухбаковых адносінах паміж Беларуссю і ЗША, гэты крок быў зроблены ў сувязі з выклікам у Вашынгтон для кансультацый пасла ЗША ў нашай рэспубліцы Кенэта Яловіца.

У дакуменце беларускага МЗС таксама адзначаецца, што наша знешнепалітычнае ведамства не можа згадзіцца з матывацыяй рашэння адносна высылкі з ЗША першага сакратара Пасольства Беларусі ў гэтай краіне Уладзіміра Грамыкі. Афіцыйныя колы Злучаных Штатаў заяўляюць, што гэта зроблена ў адказ на высылку з Рэспублікі Беларусь 24 сакавіка гэтага года першага сакратара Пасольства ЗША Сержа Аляксандрава.

Ва ўзнікшых абставінах Міністэрства замежных спраў Беларусі палічыла неабходным заявіць аб зацікаўленасці кіраўніцтва нашай рэспублікі ў далейшым развіцці ўзаемавыгадных адносін са Злучанымі Штатамі Амерыкі на раўнапраўных умовах.

У той жа час выконваючы абавязкі прэс-сакратара Дзяржаўнага дэпартамента ЗША Джон Дзінгер у ходзе праведзенага 27 сакавіка брыфінгу пацвердзіў паведамленне, якое з'явілася ў прэсе, аб тым, што менавіта Злучаныя Штаты прапанавалі кіраўніцтву нашай краіны вярнуць Валерыя Цапкалу ў Мінск. Як паведамілі БелТА ў Пасольстве ЗША ў нашай рэспубліцы, Джон Дзінгер, у прыватнасці, заявіў: "Мы лічым, што прыезд новага пасла Беларусі ў ЗША будзе цяпер недарэчы".

Ігар РУБАН,
БелТА.

Хачу спытаць...

Чаму 75 працэнтаў выбаршчыкаў Беларусі пазбаўлены права мець сваіх прадстаўнікоў у вышэйшых органах улады?

Пасля лістападаўскага рэферэндуму 1996 года 75 працэнтаў насельніцтва Беларусі пазбаўлена сваіх прадстаўнікоў у вышэйшых органах улады, хаця агульная колькасць дэпутатаў не скарацілася, а ўзрасла на 64 чалавекі.

110 дэпутатаў Вярхоўнага Савета 13-га склікання, якія перабеглі ў лукашэнкаўскі "парламент", не могуць ні ў якім разе прэтэндаваць на прадстаўніцтва інтарэсаў нават і паловы насельніцтва Беларусі, паколькі лічба 110 складае 42 працэнты ад агульнай колькасці выбарчых акруг, якіх усяго 260. Калі ж прыняць пад увагу, што за гэтых 110 дэпутатаў-перабежчыкаў рэальна ў іх выбарчых акругах галасавала 60—70 працэнтаў выбаршчыкаў, а то і менш, то неабходна прызнаць, што рэальна "Палата № 1" можа прэтэндаваць на прадстаўніцтва інтарэсаў не больш за 25 працэнтаў насельніцтва Беларусі. На практыцы гэта азначае, што з кожных чатырох грамадзян, маючых права выбіраць і быць выбранымі, рэжым Лукашэнкі толькі аднаму забяспечыў рэальна такое права.

А як жа разумець словы прэзідэнта: "Толькі народ у стане вырашаць свой лёс"? Чвэрць народа — вось табе і ўвесь народ — так, мабыць, разумее прэзідэнт.

Але падчас рэферэндуму было не толькі звужана прадстаўніцтва і правы простых людзей. Новая наменклатура і новыя чыноўнікі запоўнілі сабой створаную дзеля іх новую палату, якая называецца Сенатам.

Ніводны просты чалавек — даярка ці слесар — не прайшлі ў Сенат. Больш таго, членаў Сената не трэба было выбіраць. Яны самі сябе выбіралі, і іх прызначаў прэзідэнт.

Згодна з меркаваннямі прэзідэнта, беларускаму народу патрэбны для поўнага шчасця 64 сенатары.

У прамовах прэзідэнта А.Лукашэнкі важнае месца ўдзялялася скарачэнню колькасці дэпутацкага корпусу. Аднак пасля рэферэндуму да існуючага дэпутацкага корпусу былі дабаўлены 64 сенатары, і гэта названа не павелічэннем, а скарачэннем.

С.УРБАНОВІЧ, навуковец.
Мінск.

Афіцыйна

Карэспандэнт НТБ павінен пакінуць Беларусь

Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь выступіла з заявай наконт дзейнасці карэспандэнта тэлекампаніі НТБ Аляксандра Ступнікава. У дакуменце, накіраваным у прадстаўніцтва расійскай тэлекампаніі НТБ у Мінску, гаворыцца: "Дзейнасць грамадзяніна Ізраіля Аляксандра Ступнікава ў якасці кіраўніка прадстаўніцтва расійскай тэлекампаніі НТБ у Мінску падрывае атмасферу давер'я, добрасуседства і дружалюбнага характару адносін, якія склаліся паміж Беларуссю і Расіяй.

Яўнае скажэнне фактаў у падрыхтоўваемых ім матэрыялах, што датычаць унутрыпалітычнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь, уводзіць у зман як грамадзян Рэспублікі Беларусь, так і грамадзян іншых дзяржаў. У гэтай сувязі адпаведная нота Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь была накіравана Міністэрству замежных спраў Расійскай Федэрацыі 7 лютага 1997 года.

Такім чынам, дзейнасць замежнага грамадзяніна А.Ступнікава ўступае ў супярэчнасць з артыкулам 3 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь" у частцы, якая прадугледжвае, што "ажыццяўленне замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь сваіх правоў і свабод не павінна наносіць урону інтарэсам Рэспублікі Беларусь, правам і законным інтарэсам грамадзян Рэспублікі Беларусь і іншых асоб".

На падставе артыкула 24 названага закона грамадзяніну Ізраіля Аляксандру Ступнікаву, які парушыў заканадаўства аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь, скарачаецца тэрмін знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь да 31 сакавіка 1997 г.

У адпаведнасці з артыкулам 8 гэтага закона замежны грамадзянін Аляксандр Ступнікаў павінен выбыць з Рэспублікі Беларусь пасля заканчэння названага тэрміну".

БелТА.

АД РЭДАКЦЫІ "НАРОДНАЙ ВОЛІ".

Вось такую інфармацыю атрымалі мы па каналах дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва. Знаёмішся з афіцыйнай заявай Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і думаеш: на зыходзе другое тысячагоддзе ці вярнулася сярэднявечча? Пра якое "яўнае скажэнне фактаў" можна гаварыць, калі супраць тэлежурналіста А.Ступнікава не было ўзбуджана ні адной судовай справы? Сёння міліцэйскім чыноўнікам не падабаюцца праўдзівыя рэпартажы Аляксандра Ступнікава, заўтра такую заяву яны зробяць наконт іншых журналістаў, якія актыўна асвятляюць падзеі ўнутрыпалітычнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь. Скажыце, для каго тады існуюць законы? Як адносіцца да дзяржавы, улады якой ігнаруюць правы журналістаў, дзе дзейнічаюць з пазіцыі сілы, а не з пазіцыі здаровага сэнсу, прававых падстаў.

Інфармацыю "Карэспандэнт НТБ павінен пакінуць Беларусь" мы атрымалі ў другой палове дня 28 сакавіка. Звязаўшыся вечарам па тэлефоне з А.Ступнікавым, пачулі: "Ніякай паперы наконт дэпартацыі мне пакуль ніхто не ўручыў". І дадаў: "Схлусіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Іван Пашкевіч, калі на прэс-канферэнцыі заявіў, што ў мяне закончыўся тэрмін віда на жыхарства. Ён у мяне аж да 31 снежня 1997 года..."

Як бачым, у афіцыйных улад канцы з канцамі не зыходзяцца. Сорамна за іх дзеянні, крыўдна за дзяржаву.

І ўсё ж... Зараз, калі вы чытаеце гэтыя радкі, А.Ступнікаў можа ўжо за межамі нашай рэспублікі. Аб канчатковых выніках інцыдэнта паведамім у наступным нумары.

Для каго загаворыць "Радыё 101,2"?

Па-ранейшаму працягваецца блакада адзінага маладзёжнага беларускамоўнага радыё на хвалі 101,2 FM.

У свой час, калі радыёстанцыя была зачынена, тагачасны "галоўны ідэолаг" рэспублікі Уладзімір Замяталін і намеснік міністра сувязі Любоў Пакрышка заяўлялі, што радыёстанцыя спынена часова. А прычынай яе закрыцця называлася тое, што радыёстанцыя стварае тэхнічныя перашкоды ў прыёмных каналах ЦС РТС "Алтай". "Як толькі будуць праведзены неабходныя работы, маладзёжны канал зноў будзе вяшчаць", — сцвярджалі ўлады.

Здаецца, сёння прычын перашкаджаць журналістам выйсці ў эфір няма. Неабходная для вяшчання антэна выраблена на гомельскім радыёзаводзе "Луч" і прывезена ў Мінск. "Міністэрства сувязі не мае ніякіх прэтэнзій да "Радыё 101,2",— запэўніла мяне Любоў Пакрышка. — Як толькі рэдакцыя радыё вырашыць пытанне аб парадку вяшчання ў Мінгарвыканкаме, перадатчык будзе ўстаноўлены". Аднак гарадскія выканаўчыя ўлады да цяперашняга часу дакладнага адказу кіраўніцтву радыё не далі.

Высветліць сітуацыю, якая склалася вакол радыёстанцыі, супрацоўнікі рэдакцыі спрабавалі і ў Адміністрацыі прэзідэнта. Але нядаўні іх паход у беларускі "Белы дом" вынікаў не даў. "Ніякіх канкрэтных адказаў мы не пачулі",— паведаміў праграмны дырэктар "Радыё 101,2" Зміцер Новікаў. Ён не выключае, што ў хуткім часе на хвалі 101,2 FM замест знаёмых галасоў вядучых радыёслухачы змогуць пачуюць іншыя. "Прэзідэнт не раз выказваў думку аб аб'яднанні ўсіх маладзёжных арганізацый у адзіную, а вясной на маладзёжным форуме заявіў, што аддае хвалю 101,2 FM Саюзу моладзі. Я не здзіўлюся, калі на нашай хвалі пачне вяшчаць "Прамое дзеянне". Менавіта гэтай маладзёжнай арганізацыі патрэбныя свае органы агітацыі і прапаганды",— адзначыў Зміцер Новікаў.

Што тычыцца рэдакцыі "Радыё 101,2", то журналісты працуюць у звыклым рэжыме, праўда, цяпер як інфармацыйнае агенцтва. Яны рыхтуюць матэрыялы для замежных кампаній. Акрамя таго ў гэтым годзе пачало працаваць рэкламна-інфармацыйнае агенцтва "101,2" — новы праект супрацоўнікаў радыёстанцыі.

Марыя ЭЙСМАНТ.

Хочется пожелать газете...

Больше печатать репортажей о конкретных людях, а не только о политиках. Рассказывайте о предпринимателях, педагогах, врачах, дачниках. Публикуйте рекомендации по бизнесу. Желательно усилить тему патриотического воспитания — привлечь к сотрудничеству с редакцией Миколу Ермаловича и Михася Тычину. Нужно публиковать материалы об известных в мире белорусах, чаще выходить на интервью с известными писателями, артистами, спортсменами, которые любят Беларусь. Можно было бы расширить литературную страничку и объявить конкурсы на лучшее стихотворение, очерк, рассказ.

Я понимаю, что вам трудно реализовать свои планы: не хватает штатных сотрудников. Надо привлекать читателей и все силы бросить на борьбу за Беларусь. Успехов вам!

Василий ШЕПЕЛЕВИЧ.
г.Мозырь.

* * *

...**давать в каждом номере** указы и постановления с грамотными комментариями;

— статьи о важных экономических и политических событиях, написанные живым языком;

— статьи по истории Беларуси и ввести рубрику "Исторические даты Беларуси".

В.РЯБУХИН,
пенсионер.
г.Минск.

Палітыка і аўтарытэты

Грушавы рыхтуецца да сустрэчы з Колем

Яна павінна адбыцца летам. І калі ўлічыць, што канцлер Германіі вельмі скрупулёзна ставіцца да падбору субяседнікаў, дык ужо сам гэты факт гаворыць пра многае.

Толькі што Генадзь Грушавы, кіраўнік дабрачыннага фонду "Дзецям Чарнобыля" і вядомы грамадскі дзеяч, вярнуўся з Бона, дзе ён меў гутарку з прэзідэнтам бундэстага Рытай Зюсмут, з прадстаўнікамі вядучых дэпутацкіх фракцый парламента ФРГ.

Наш карэспандэнт сустрэўся з Грушавым і папрасіў яго расказаць пра вынікі візіту ў Германію.

— Усе палітычныя і грамадскія колы ФРГ, — пачаў ён, — занепакоены грубым парушэннем правоў чалавека ў Беларусі. Яны збіраюцца давесці да кіраўніцтва нашай краіны, што Еўропа чакае ад яго зусім іншых крокаў і дзеянняў.

— Аб чым ішла размова са спадарыняй Зюсмут?

— Аб аказанні дапамогі ахвярам Чарнобыльскай аварыі. Прэзідэнт германскага парламента апошнія два гады курыруе праграмы гуманітарнага супрацоўніцтва па чарнобыльскай тэматыцы. У іх ажыццяўленні бяруць удзел многія дэпутаты, міністры, вядомыя грамадскія дзеячы. Усіх іх непакояць штучныя перашкоды, якія чыняцца беларускім бокам.

Была гаворка і аб сітуацыі ў Беларусі. Кіраўнік бундэстага лічыць, што наш прэзідэнт павінен пачаць перамовы з кіраўніцтвам Вярхоўнага Савета, які з'яўляецца легітымным заканадаўчым органам. Крок да дыялога, на яе думку, быў бы добрым знакам для Еўропы.

— Няўжо ў Германіі лічаць, што такое магчыма?

— Там ведаюць, што ключ да вырашэння беларускіх праблем знаходзіцца ў Крамлі. Таму Еўропа збіраецца растлумачыць гэта расійскім палітыкам. Ім прыйдзецца выбіраць — ці "восьмае крэсла" ў элітарным клубе "сямёркі", якая можа стаць "васьмёркай", ці падтрымка сучаснага рэжыму ў Беларусі?

— Але ўціску на Расію за яе падтрымку беларускіх улад пакуль не відаць.

— Ён пачынаецца. Ужо ў час візіту Ельцына ў Германію, які чакаецца ў красавіку, расійскаму прэзідэнту будзе не соладка за дзеянні ў адносінах да Беларусі. У яго перамовах з Колем пакуль не стаіць асобным пунктам сітуацыя ў Беларусі. Але мае нямецкія субяседнікі даводзілі, што пытанне гэта будзе ўзнята Колем. Больш таго, у час візіту чакаюцца пікеты і маніфестацыі грамадзян Германіі каля расійскага пасольства і рэзідэнцыі, дзе будзе праходзіць сустрэча Коля з Ельцыным. Варта нагадаць, што падобных "сустрэч" з кіраўніком з Масквы ўжо даўно не наладжвалі.

— Чым выклікана цікавасць канцлера Германіі да вашай персоны? І якія праблемы вы збіраецеся абмяркаваць?

— Найперш, чарнобыльскую. Дапамога ахвярам трагедыі набыла ў Германіі глыбокі сэнс. У праграмах задзейнічаныя многія грамадзяне. А наш фонд аб'ядноўвае каля трохсот ініцыятыў у ФРГ. Праз нас немцы могуць рэалізоўваць свае планы. І вось цяпер, калі яны адчулі пагрозу гэтай праграме, відаць, сам Коль вырашыў заняцца ёю. І другая праблема — правы чалавека ў Беларусі і што можа і павінна зрабіць Еўропа для нас.

— Да нас дайшлі чуткі аб рэакцыі ў Германіі на праверку вашага фонду. Яна, як вядома, не першая. Чым жа выклікана?

— Амаль год фонд правяралі розныя арганізацыі. Былі правяраючыя з гарадской і рэспубліканскай пракуратур, кантрольнай службы прэзідэнта, падатковай службы. І не выявілі парушэнняў законаў. Нам нават сказалі, што пасля такой "ператраскі" доўга не будзе ніякіх праверак. І вось на табе, чарговая. У нас ёсць адчуванне, што рашэнне па фонду ўжо падрыхтаванае і шукаюць хоць нейкія зачэпкі.

— Чым жа не падабаецца фонд?

— Мяркую, проста пачалася атака на няўрадавыя арганізацыі, дабрачынныя фонды. Апазіцыя па сутнасці выведзеная за рамкі рэальных уплывовых структур. Патрэбны новыя апаненты для барацьбы. Гэта выклікае неразуменне на Захадзе. Я атрымаў запрашэнне на сустрэчу з кіраўніком Еўрапарламента, якая адбудзецца ў першай палове красавіка. Размова будзе весціся якраз аб гэтым.

Алесь ДРАБЧУК.

Да ўвагі чытачоў

Вы, шаноўныя сябры, маглі атрымаць "Народную волю" і ўчора. Затрымка адбылася не па нашай віне. У сувязі са святам і выхаднымі ў ноч з 31 красавіка на 1 сакавіка не працавалі друкары і экпедыцыя па дастаўцы перыядычных выданняў, а таму вы засталіся без чарговага нумара. Рэдакцыя робіць усё, што ад яе залежыць, каб вы атрымоўвалі газету без перабояў.

Рэдакцыя "Народнай волі".

Дыпламатычны кур'ер

Новы кіраўнік італьянскага пасольства пачаў выконваць свае абавязкі

Інтарэсы Італьянскай Рэспублікі ў нашай краіне цяпер будзе прадстаўляць Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол гэтай дзяржавы ў Беларусі Джавані Чэроці.

Ён нарадзіўся ў Генуі ў 1942 годзе. У 1966 годзе ён закончыў юрыдычны факультэт універсітэта "Сакра Куорэ" ў Мілане. На дыпламатычную службу паступіў у 1971 годзе. Потым працаваў ва ўпраўленні па пытаннях палітыкі МЗС Італіі. З 1974 па 1978 год займаў пасады намесніка консула, а затым консула ў Таронта, працаваў першым сакратаром Пастаяннага прадстаўніцтва Італіі пры Савеце Еўропы ў Страсбургу. Пазней пан Чэроці быў саветнікам пасольства сваёй краіны ў Германіі, гандлёвым саветнікам Італіі ў Швейцарыі, начальнікам аддзела ўпраўлення па пытаннях палітыкі МЗС. У снежні 1996 года дыпламат назначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Італіі ў Рэспубліцы Беларусь. Ён жанаты, мае дваіх дзяцей.

Адным смяротным "скарбам" стала менш

Мінулая вайна зноў напомніла аб сабе. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ва ўпраўленні інжынерных войскаў Міністэрства абароны Беларусі, недалёка ад палатна чыгункі на 844-м кіламетры пуці, які звязвае Брэст з Масквой, у выніку правядзення земляных работ рабочыя знайшлі цэлы "скарб" выбуханебяспечных прадметаў.

Атрад размініравання Дзяржынскага сапёрнага батальёна пад кіраўніцтвам старшага лейтэнанта Барыса Васільца на працягу дня выявіў і знішчыў 60 мінамётных мін, 27 процітанкавых снарадаў, адну ручную гранату, больш за 20 тысяч патронаў. Акрамя таго, у падземным сховішчы знаходзіліся тры кулямёты і мінамёт. Уся зброя — нямецкай вытворчасці.

Пакуль ішла работа сапёраў, рух па чыгуначнай трасе не спыняўся.

Ігар РУБАН.

Аб Андрэі Таркоўскім мінчанам напомняць яго фільмы

Рэтраспектыва фільмаў Андрэя Таркоўскага пройдзе з 7 па 28 красавіка ў сталічным кінатэатры "Піянер". Яна прысвечана 65-й гадавіне з дня нараджэння славутага кінарэжысёра, якая будзе адзначацца 4 красавіка.

Як стала вядома карэспандэнту БелТА, паклоннікі творчасці майстра змогуць убачыць у гэтыя дні самыя вядомыя работы Андрэя Таркоўскага. 7 красавіка гледачам будзе прадстаўлена двухсерыйная кінастужка "Анрэй Рублёў", 14 красавіка — "Салярыс", а 21 — "Люстэрка". Завершыцца рэтраспектыва 28 красавіка паказам кінакарціны "Сталкер".

Аксана ПІВАВАР.

За ўзбекскую бавоўну патрабуюць цвёрдую валюту

У пачатку года рэзка скараціўся імпарт бавоўны з Узбекістана. Беларускія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці не ў стане своечасова і ў поўным аб'ёме разлічвацца за сыравіну.

У 1996 годзе ў рамках міжурадавага пагаднення паміж дзвюма краінамі прадугледжвалася паставіць у Беларусь 12 тысяч тон баваўнянага валакна на клірынгавай аснове. Пагадненне было выканана на 84 працэнты, пры гэтым запазычанасць беларускага боку перавысіла 85 мільярдаў рублёў. Узбекістан разглядае магчымасць захавання клірынгавай лініі ў 1997 годзе, аднак ужо ў недалёкай будучыні плануе поўнасцю перайсці на разлікі ў цвёрдай валюце.

Уладзіслаў ПЛАТУН.

Крымінал

У Віцьбе выкралі... чыгунку

Грамадзянін Італіі С., супрацоўнік адной з будаўнічых фірм, якая працуе ў Беларусі, быў вельмі збянтэжаны тым, што ў мытнай зале Брэсцкага чыгуначнага вакзала ў яго прапалі 9 шчанят розных парод, аб чым ён экстранна паведаміў у мясцовы аддзел унутраных спраў на транспарце.

Але, калі шчанят можна непрыметна вынесці ў звычайнай гаспадарчай сумцы, то ўявіць, як выкралі 325 метраў рэек з нерабочага пуці станцыі Віцьба, больш складана. З заявай аб менавіта такой прапажы звярнулася ў сваю транспартную міліцыю адміністрацыя Віцебскай дыстанцыі пуці.

Лавілі злодзея, злавілі "збройніка"

Калі супрацоўнікі Калінкавіцкага аддзела ўнутраных спраў на транспарце затрымалі на станцыі Васілевічы машыніста лакаматыўнага дэпо Гомель грамадзяніна Б. з 40 літрамі злітага з цеплавоза дызпаліва, яны і не думалі, што пры гэтым выявяць яшчэ і яго ўласны зброевы склад. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў прэс-службе ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце, пры асабістым аглядзе ў машыніста знайшлі і канфіскавалі самаробны пісталет, прыстасаваны для стральбы малакаліbернымі патронамі, і 16 патронаў да яго. А пры вобыску яго жылля выявілі яшчэ і 7 вінтовачных патронаў, затвор ад малакалібернай вінтоўкі, паляўнічую стрэльбу замежнай вытворчасці, 18 самаробных нажоў і больш за 3 тысячы малакаліберных патронаў.

Таццяна СМІРНОВА.

Чэхі да канца года прадоўжваюць спрошчаны варыянт перасячэння граніцы для беларускіх дзяцей, якія накіроўваюцца на аздараўленне

У сувязі з запытамі, што паступаюць ад турыстычных фірм і грамадскіх арганізацый, якія займаюцца аздараўленнем дзяцей у Чэхіі, МЗС Беларусі паведаміла, што беларускія грамадзяне выязджаюць у Чэшскую Рэспубліку на ўмовах дагавора паміж СССР і ЧССР, які не прадугледжвае ўзаемныя спісы дзіцячых груп.

Аднак, улічваючы ўзнікшую ў Беларусі пасля аварыі на ЧАЭС экалагічную абстаноўку і неабходнасць рэгулярнага аздараўлення вялікай колькасці дзяцей, а таксама існуючыя прамыя партнёрскія сувязі паміж дзвюма дзяржавамі, чэшскі бок паведаміў у беларускае Міністэрства замежных спраў аб тым, што палічыў магчымым прадоўжыць да канца бягучага года практыку праезду па спісах дзіцячых груп, якія накіроўвацца ў Чэхію на аздараўленне. Форма гэтых спісаў павінна быць узгоднена ў МУС Беларусі.

Абавязковай умовай пры гэтым застаецца папярэдняе паведамленне (не менш, чым за два тыдні) чэшскаму боку праз беларускае пасольства ў гэтай дзяржаве аб месцы і тэрмінах перасячэння граніцы.

БелТА.

Нужно ли было способствовать тем, кто готов был поджечь "белорусский Рейхстаг"?

Владимир ПОДГОЛ,
доцент, кандидат философских наук, руководитель информационно-аналитического центра Президиума Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва

Несмотря на мирное время, драматизм событий порой достигает наивысшего накала. Так было в предреферендумные дни. Сейчас, когда политические страсти несколько поутихли, нет-нет да и вспыхивают страсти журналистские. Многим, кто считает себя спецом в политике, хочется высказаться по поводу текущего и прошедшего момента и как бы очертить то русло исторического течения, в которое не вошли лидеры белорусской политики и соответственно "не туда" повели белорусский народ.

Основные тезисы оппонентов лидеров Верховного Совета 13-го созыва со стороны демократического же лагеря выглядят следующим образом. Одни обвиняют Президиум в том, что он в критические моменты не обратился к народу за помощью и не добился явки к Верховному Совету нескольких сот тысяч граждан республики. Вместо этого, мол, сами пошли, "как на областной семинар по проблемам животноводства", на переговоры с Черномырдиным. Другие держат обиду за то, что их не допустили с площади в здание Верховного Совета для его защиты.

И еще одна спасательная версия — "палаточная". Говорят, надо было, когда слова не давали по телевидению Шарецкому, разбить палатку и объявить голодовку. А если бы еще и Гончар с палаткой пришел к Центризбиркому, то получился бы республиканский антитоталитарный шатер. И вот тогда-то... Что было бы тогда-то — советчики не договаривают. Есть, правда, мнение, что "тогда-то" все узнали бы, что в стране есть ЛИЧНОСТЬ, за которой можно идти и в огонь, и в воду. Что касается появления на исторической сцене такой ЛИЧНОСТИ, — это еще вопрос. А вот то, что подарили бы Лукашенко возможность сделать из Шарецкого посмешище, сомнений не вызывает. Представьте себе как он, хитровато улыбаясь в свои усы, ёрничая, обращается к телезрителям по поводу комплекции Семена Георгиевича, голодовки и... послания Жириновского с сообщением о подарке спикеру в виде жареных поросят...

Если выразиться в стиле "стёб", то можно было бы коротко ответить, что тогда, по выражению С.Букчина, автора одной из хлестких статей в "Народной воле", такая ЛИЧНОСТЬ как Лукашенко, точно прикончил бы и демократию на Беларуси, и Верховный Совет, и все остальное... А уж статьи антитоталитарного характера да и свободная пресса вообще бы исчезли, и мы бы не узнали мнение многих критиков и аналитиков.

Что же происходило осенью 1996 года в Беларуси? Какой сценарий развития политических событий готовил Лукашенко и что могли противопоставить ему депутаты Верховного Совета и его Президиум?

Прежде всего определим критерий действий той и другой стороны.

Я уверен, что Лукашенко ставил следующие цели:

1. Как и в первый год своего президентства, уйти от неприятнейшей конституционной процедуры — выступления перед Верховным Советом с отчетным докладом, по которому должны были развернуться соответствующие прения.

2. Сконцентрировать абсолютно всю власть в своих руках.

3. Продлить время своего президентства.

4. Всего этого достичь легитимным по форме путем.

5. В случае неудачи заложить в глубинные слои сознания избирателей образы своих оппонентов как ВРАГОВ, вызывающих разную степень СТРАХА. А себя идолоизировать в ЗАЩИТНИКА от этих ВРАГОВ, причем ЗАЩИТНИКА разных модификаций — от ТЕРМИНАТОРА ДО СОЗИДАТЕЛЯ. И в случае повторных выборов не только депутатов, но и президента, вновь разгромить своих ВРАГОВ и ВРАГОВ народа. Среди этих ВРАГОВ главными Лукашенко хотел сделать членов Президиума Верховного Совета, превратив их во ВРАГОВ интеграции с Россией и в смертельных ВРАГОВ белорусского народа.

6. Убрать помеху — Верховный Совет — на пути присоединения Беларуси к России.

Президиум Верховного Совета, в свою очередь, ставил такие цели:

1. Сохранить демократические ростки в белорусском социуме в виде разделения властей.

2. Раскрыть обществу глаза на суть происходящих процессов и планов Лукашенко.

3. Не позволить Лукашенко легитимным образом обставить конституционный переворот.

4. Создать условия для того, чтобы пути сползания Беларуси в тоталитаризм трансформировались в более активное продвижение республики в сторону демократизации.

5. Продолжить работу по совершенствованию Конституции 1994 года с целью расширения правовых возможностей для демократизации Беларуси и реформирования экономики.

6. Сохранить суверенитет Беларуси, действуя в рамках Конституции 1994 года.

Что делало окружение Лукашенко для осуществления целей шефа?

Как когда-то на заре перестройки прозомбировали в сознании миллионов граждан З.Позьняка и БНФ, представив их как ВРАГОВ, КОТОРЫЕ НЕСУТ СМЕРТЬ. Точно так зомбировали депутатов Верховного Совета и членов Президиума. Для этого:

а) вначале применялись информационные технологии расчеловечивания.

Депутаты-демократы характеризовались для избирателей как "жирные коты", прогуливающиеся по асфальту Минска с флажками в то время, когда весь трудовой народ в поте лица сражается во главе с президентом за урожай. Банкиры-предприниматели были представлены в виде "вшивых блох", которые искусали народ и объели его. Депутатов Верховного Совета Лукашенко опустил до "петухов";

б) затем следовали технологии актуализации иррациональных ожиданий смертельных ВРАГОВ. Начало этих технологий было заложено двумя смертельными вопросами референдума о переносе Дня независимости и отмене смертной казни. Обсуждение этих вопросов в подкаблучных средствах массовой информации и актуализировало ожидание появления ВРАГОВ, несущих смерть;

в) следующий этап подготовительных к зомбированию технологий заключался в придании ряду политиков статуса функциональных фигур "предателей" (оборотней). Так, лидеры компартии Новиков и Калякин клеймились как предатели ветеранов и коммунистов за то, что сели за один стол с бэнээфовцами. Шарецкий после поездки в США был представлен агентом ЦРУ, точно так, как и Тихиня. Карпенко и Богданкевич представлялись предателями белорусского народа, ибо, по определению лукашенковцев, представляли буржуазную партию, ставящую цель грабить трудовой народ;

г) после расчеловечивания депутатов и превращения их в предателей следовал заключительный этап — собственно технология зомбирования на смерть.

В радиоэфире звучало следующее: ветераны в своих письмах требуют для таких как Новиков и Калякин оставить смертную казнь. Новиков ради своих корыстных интересов готов мать родную к стенке поставить. Неужели Богданкевич и Карпенко не знают, что в Беларуси во время Великой Отечественной войны погиб каждый третий, Чернобыль принес смерть на нашу землю? А они хотят развязать гражданскую войну в республике и залить ее кровью.

И, наконец, накануне заключительного дня референдума по радио зазвучала уникальная зомбирующая идеологема в отношении всего Верховного Совета: "В Москве в 1993 году ставленник буржуазии — президент танками расстрелял Верховный Совет, а у нас в Беларуси происходит все наоборот. Буржуазный Верховный Совет готов расстрелять президента — единственного защитника народа".

Зомбирующие информационные технологии в сознании людей опирались на созданный теми же подкаблучными средствами массовой информации образ депутатов как аморальных людей, пришедших в парламент ради привилегий и сладкой жизни, стремящихся урвать себе еще больше власти у Лукашенко, да еще мешающих президенту строить лучшую жизнь.

Депутатам и членам Президиума оставалось только сыграть на политической арене заключительную сцену в политическом спектакле и роль, отведенную им президентскими сценаристами: призвать в здание Верховного Совета НАРОД. И вот тогда-то вместе с народом вошли бы профессиональные провокаторы. Подожгли бы пару-тройку кабинетов — помните перевернутые машины во время Чернобыльского шляха? Выбили бы с десяток окон, в тесноте коридоров проломили бы пару черепушек. Если уж вспоминать польских интеллектуалов из Кос-Кор, то следует вспомнить и Вильнюс, и пристреленного своими же агента спецслужб во время штурма телецентра! Словом, мог повториться вариант с поджогом Рейхстага в Германии. (Вспомните, как президентские СМИ распространили слух о канистрах с бензином в зале Верховного Совета.) И уж тогда на Беларуси фашизм закрепился бы основательно.

Призвав народ в здание Верховного Совета, Президиум выпустил бы ситуацию из-под контроля. Далее, на мой взгляд, все развивалось бы по сценарию уже известной депутатской голодовки: вынос тел "хулиганствующих" депутатов, которые "перепились" и в пьяном угаре чуть не уничтожили здание оплота демократии. Да еще чуть не изнасиловали секретарш! Защитим хрупких "жэншчын" и мисс Демократию Беларуси от смертельных ВРАГОВ — депутатов и уличных хулиганов! И снова Лукашенко выступил бы в роли ЗАЩИТНИКА, на этот раз — хрупкой белорусской ДЕМОКРАТИИ.

Зомбирующие технологии получили бы мощнейшее закрепление в сознании миллионов граждан Беларуси, а Лукашенко получил бы возможность на основании Конституции 1994 года распустить Верховный Совет!

Кстати, тем, кто обвиняет членов Президиума, что зря, мол, не звали народ на площадь, скажу: Шарецкий не просто звал, он кричал, и его голос разнесло зарубежное телевидение не только по Беларуси, но и по всему миру! И кричал он не как колхозник, которому наплевать на колхозное добро, а как крестьянин, как ХОЗЯИН, у которого горит и дом, и хлев, и заботливо выращенный урожай! Кричал и звал людей к парламенту, но пришло столько, сколько пришло.

Кстати, вопрос о повторном приглашении людей на площадь в поддержку Верховного Совета обсуждался во время одного из заседаний депутатов. И в это время рабочие — сторонники Верховного Совета — с тракторного завода сообщили о том, что возле проходных предприятий стоят автобусы и по приказу Лукашенко туда вот-вот начнут сажать сторонников Лукашенко, чтобы везти к Верховному Совету для... защиты президента. Каждому президентскому "защитнику" почти как во время войны предписано было, правда, не по 200 граммов водки, а по 200 тысяч "зайцев". Желающих обогатиться оказалось немного, но очевидно, что в рабочих спецовках к Верховному Совету в автобусах планировали подвести профессиональных провокаторов со стриженными затылками. Побоище могло возникнуть на самой площади.

Образ смертельных ВРАГОВ президента и белорусского народа после продемонстрированной Президиумом выдержки и гибкой тактики рассыпался. Зомбирующие технологии не сработали на полную мощность.

А переговоры Шарецкого с Черномырдиным уничтожили в сознании избирателей идолов ВРАГОВ интеграции с Россией, вылепленных из членов Президиума.

В итоге Верховный Совет 13-го созыва признан мировым и европейским сообществом (53 страны Европы) легитимным, а палаты президента — нелигитимными. Лукашенко загнан или, если хотите, поставлен в политический угол и назван политическим хулиганом-диктатором. Как оказалось, в подобном же углу, только политологическом, оказались некоторые пишущие по поводу политики. В Беларуси возникла нестандартная ситуация, анализ которой невозможен при простом калькировании западных схем на нашу совковую реальность, даже если они взяты у ближайшей соседки Польши. Слепое следование западным схемам привело к тому, что на страницах демократических газет появились рассуждения типа "вот если бы к авторитету Л.Валенсы приставить напор личности Лукашенко и трансплантировать этому трансформеру мозги лучших интеллигентов Беларуси..."

Критики руководства Верховного Совета приготовились было повеселиться от драчки парламента с президентом, и одни были страшно огорчены тем, что не испытали острых ощущений 1917 года, другие сожалели о том, что не увидели "драки двух колхозников". Помните, что Лукашенко, "кируя" совхозом, чуть что, бил подчиненных по носу. Вот и здесь ждали, что в ответ на удары по Верховному Совету другой бывший председатель колхоза ответит тем же. Но Шарецкий оказался "колхозником" с академическими званиями и действовал, соответственно, академически. Вы нам ударчик, мы фиксируем в протокол, вы еще хулиганить... так, записываем. Для суда. Время суда придет — суда как исторического, так и народного и, естественно, суда вроде Нюрнбергского процесса... Колхозники и банкиры, демократы и коммунисты из Президиума применили обычный цивилизованный прием против политического бандита. И легитимность Верховного Совета сохранили, и президента поставили в угол. Более того, создали условия для Лукашенко: если хочешь выйти из угла, то выходи по-европейски — правовой походкой, а не армейско-диктаторским печатным шагом.

Как известно, президент любит спорт и, особенно, единоборство с самим собой. А в различных видах борьбы есть такие приемы, когда сопернику не просто дают провести его прием, но продолжают его — и тогда соперник пролетает на своем же приеме. Лукашенко получил возможность не только без сопротивления с кровопролитием сфальсифицировать референдум, но и, опьяненный легкой победой над Верховным Советом, сам назначил депутатов в палаты своего парламента и тем самым без всякого сопротивления, выходящего за рамки закона, и необходимости бороться за установление ПОРЯДКА установил диктатуру.

Были ли ошибки в деятельности Верховного Совета и его руководства на протяжении всей его деятельности? Были! Правда, критерий их выявления и уровень критики должен быть иной, и об этом отдельный разговор.

Главный итог политической битвы 1996 года между президентом и депутатами Верховного Совета, стоящими на позиции Конституции 1994 года, в том, что парламент, действуя строго по закону, оказался в роли "политического рычага", который Лукашенко подсунул и под себя, и под свою политику.

Опираясь на этот рычаг, и должны строить свою дальнейшую работу те, кто до конца остался верен демократическим принципам. Только честными, порядочными средствами можно ввести жизнь в Беларуси в нормальное цивилизованное русло, выкорчевав все то, что мешает стране стать правовым европейским государством.

Поздравление через газету

Почетная грамота – это высокая награда, а не бумажка...

Убедительно прошу "Народную волю" опубликовать список лиц, награжденных Почетной грамотой Президиума Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва за большой личный вклад в ликвидацию последствий аварии на Чернобыльской АЭС (список прилагается).

В ноябре 1996 года, накануне референдума, Президиум Верховного Совета Республики Беларусь провел награждение этих лиц по представлению Комиссии по проблемам чернобыльской катастрофы. К глубокому сожалению, изменение политической ситуации в стране не позволило провести это награждение на должном уровне. Мы были готовы торжественно вручить награды, однако министерства и ведомства не обеспечили явку награжденных. Причем я неоднократно обращался с просьбой по этому вопросу и к исполнительной власти на местах. Обидно, что вместо торжественной обстановки вручения грамот, как это было принято всегда, их просто раздали чиновники министерств и ведомств или "вертикальщики" как обыкновенную бумажку.

Я хочу от имени Комиссии по проблемам чернобыльской катастрофы Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва и себя лично принести этим достойным людям свои глубокие извинения и через газету искренне поздравить их с этой заслуженной наградой, поблагодарить за личный вклад в ликвидацию последствий чернобыльской катастрофы и пожелать им крепкого здоровья, счастья, успехов в дальнейшей работе.

В.ХОМИЧ,
депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, председатель Комиссии по проблемам чернобыльской катастрофы.

Список лиц, награжденных Почетной грамотой Президиума Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва за большой личный вклад в ликвидацию последствий аварии на Чернобыльской АЭС

АРТЮШЕНКО Николай Васильевич — председатель колхоза им.Фрунзе Наровлянского района;

БЕЛОУСОВ Сергей Николаевич — пенсионер МВД, инвалид I группы;

ЗЕЗЕТКО Иван Адамович — председатель колхоза "Октябрь" Наровлянского района;

КАБАНЮК Григорий Матвеевич — каменщик совхоза "Подолесье" Речицкого района;

КОВАЛЕЦ Владимир Леонидович — председатель колхоза "Чырвоны Кастрычнік" Брагинского района;

КОРОЛЬ Станислав Николаевич — пенсионер, инвалид;

КРИВАЛЕВИЧ Вера Григорьевна — заведующая Ольманским фельдшерско-акушерским пунктом Столинского районного территориального объединения;

МАСЛОВСКАЯ Татьяна Михайловна — заведующая детским отделением Республиканского диспансера НИИ радиационной медицины;

ОБРАЗОВ Михаил Евгеньевич — президент Белорусской ассоциации чернобыльских организаций "26 апреля";

ПАРТЫКО Леонид Михайлович— директор Наровлянского спецлесхоза;

ПРОТЧЕНКО Татьяна Ивановна — член Белорусской ассоциации чернобыльских организаций "26 апреля";

РОДНИКОВ Анатолий Анатольевич — член Белорусской ассоциации чернобыльских организаций "26 апреля";

СТОРОЖЕНКО Владимир Павлович — тракторист колхоза им.Фрунзе Наровлянского района;

ТРИКИШ Николай Дмитриевич — пенсионер, инвалид II группы;

ТЮХЛОВ Николай Никифорович — вице-президент Белорусской ассоциации чернобыльских организаций "26 апреля";

ХЛОПОК Владимир Николаевич — председатель колхоза "Головчицы" Наровлянского района;

ХРАМОВ Иван Иванович — электросварщик III разряда цеха по монтажу, ремонту и техническому обслуживанию ОЖФ Краснопольского РАПТС;

ЯГУР Валерий Викторович — член Белорусской ассоциации чернобыльских организаций "26 апреля";

БАРАНОВА Светлана Петровна — начальник отдела изыскательских работ по сельскохозяйственной радиологии и токсикологическим исследованиям Могилевской областной проектно-изыскательной станции химизации сельского хозяйства;

БЕЙМАНОВ Михаил Анисимович — врач-хирург, заведующий хирургическим отделением Хойникской ТМА;

БОРДАК Мария Ивановна — заведующая отделом радиологии Гомельской облветлаборатории;

БОРОВСКИЙ Анатолий Николаевич — инженер-химик-технолог, член Белорусской ассоциации чернобыльских организаций "26 апреля";

ГИТЧЕНКО Владимир Устинович — маляр межхозяйственной передвижной механизированной колонны N 116 объединения "Мозырьсельстрой";

ЕСМАН Андрей Кузьмич — главный агроном колхоза "Большевистская победа";

ЛЯГУН Надежда Моисеевна — доярка совхоза "Судково";

МАРЧЕНКО Тихон Борисович — механизатор экспериментальной базы "Стреличево";

НАЗАРЕНКО Степан Иванович — водитель Хойникского районного предприятия по производственно-техническому обслуживанию "Агропромтехника";

РУДКОВСКАЯ Надежда Дмитриевна — экономист Хойникского розничного торгового объединения;

САЦУРА Михаил Моисеевич — механизатор колхоза им.XXI съезда КПСС;

СЕНЬКО Василий Евгеньевич — заместитель командира авиаэскадрильи применения авиации в народном хозяйстве Минского летного отряда N 2;

ТКАЧЕНКО Анатолий Яковлевич — первый заместитель председателя Хойникского райисполкома, начальник районного управления сельского хозяйства и продовольствия;

ЧЕРКАС Николай Сергеевич — директор экспериментальной базы "Стреличево";

ШАВЕЛЬ Чеслав Михайлович — авиационный техник Минской авиационно-технической базы местных воздушных линий и применения авиации в народном хозяйстве;

ЯНУШКЕВИЧ Николай Димитрович — командир авиаэскадрильи вертолетов Ми-2 летного отряда государственного предприятия "Аэропорт Гомельавиа";

ОСМОЛОВСКИЙ Святослав Александрович — заместитель начальника школы по воспитательной работе Могилевской школы милиции;

БОГДАНОВ Александр Терентьевич — милиционер-водитель отдела внутренних дел Октябрьского райисполкома г.Витебска;

ГРИГОРОВИЧ Леонид Витальевич — начальник отдела внутренних дел Хойникского райисполкома Гомельской области;

ГУКОВ Анатолий Кузьмич — техник-строитель, директор малого государственного предприятия "Хойникремстрой" Гомельского областного проектно-ремонтно-строительного объединения;

ДУБОВЕЦ Владимир Никанорович — машинист бурильно-крановой машины строительно-монтажного управления N 3 объединения "Бел-сельэлектросетьстроя" Минтопэнерго;

ЕРМАКОВИЧ Александр Иванович — старший преподаватель кафедры охраны гражданского порядка Академии МВД;

КУЗЬКИН Владимир Ильич — заместитель начальника гражданской обороны Минской области;

ПАНФИЛЕНКО Владимир Иванович — заместитель начальника отдела уголовного розыска УВД Брестского облисполкома;

ПЕКАРСКИЙ Владимир Иванович — начальник Гродненского областного отдела объединения "Охрана";

ПЕРЕКРЕСТ Владимир Александрович — старший преподаватель цикла общеправовых и социальных дисциплин Учебного центра МВД;

ПОПОВ Валерий Иванович — начальник Минского областного управления объединения "Охрана";

СИЛИЧ Петр Сергеевич — генеральный директор производственного объединения энергетики и электрификации "Гомельэнерго";

СОТНИКОВ Николай Григорьевич — директор Гомельского учебного комбината производственного управления жилищно-коммунального хозяйства Гомельского облисполкома;

ТЕЛУШКИН Михаил Иванович — старшина милиции, председатель Гомельского отдела внутренних дел на транспорте;

ФРАНЦУЗОВ Александр Николаевич — заместитель командира отряда особого назначения УВД Мингорисполкома;

ШИЛОВ Василий Петрович — начальник отдела внутренних дел Быховского райисполкома Могилевской области.

Грузия

Эдуард Шеварднадзе считает, что на первом месте должно стоять развитие двусторонних отношений со странами СНГ

